Пенсійнае забеспячэнне

Пытанне: Пры якіх умовах прызначаецца пенсія па ўзросце на агульных падставах?

У адпаведнасці з артыкулам 11 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб пенсійным забеспячэнні" ад 17 красавіка 1992 г. № 1596-XII (далей - Закон) права на пенсію па ўзросту на агульных падставах маюць мужчыны пры агульным стажы працы не менш за 25 гадоў, жанчыны пры агульным стажы працы не менш за 20 гадоў пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

У 2023 годзе агульнаўстаноўлены пенсіённы ўзрост для мужчын складае 63 гады, для жанчын - 58 гадоў.

Згодна з артыкулам 5 Закона ў 2023 годзе неабходны для назначэння пенсіі па ўзросту страхавы стаж складае 19 гадоў і штогод павялічваецца на 6 месяцаў да дасягнення 20 гадоў да 2025 года.

Пытанне: Якая пенсія можа быць назначана грамадзяніну пры адсутнасці неабходнага страхавога стажу?

У адпаведнасці з заканадаўствам асобным катэгорыям грамадзян прызначэнне пенсіі ажыццяўляецца са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама для назначэння пенсіі па ўзросту патрабуецца страхавы стаж меншай працягласці (бацькі дзяцей-інвалідаў (інвалідаў з дзяцінства); шматдзетныя маці, якія нарадзілі пяць і больш дзяцей; інваліды з дзяцінства, і г.д.).

Грамадзянам, якія не маюць права на працоўную пенсію па ўзросту ў сувязі з адсутнасцю патрабаванага страхавога стажу, якія не адносяцца да "льготных" катэгорый, можа быць назначана:

– працоўная пенсія па ўзросце пры няпоўным страхавым стажы - калі ёсць страхавы стаж не менш за 10 гадоў, але менш патрабаванага (у 2023г. - 19 гадоў) па дасягненні ўзросту жанчынамі - 60 гадоў і мужчынамі - 65 гадоў (памер пенсіі будзе залежаць ад наяўнага страхавога стажу);

– сацыяльная пенсія - калі страхавога стажу няма або ён менш за 10 гадоў, па дасягненні ўзросту жанчынамі - 60 гадоў і мужчынамі - 65 гадоў (памер пенсіі будзе складаць 50% бюджэту пражытачнага мінімуму).

Па пытаннях можна звяртацца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лельчыцкага райвыканкама (каб.113, вул. Савецкая, 42, г.п. Лельчыцы) альбо па тэл. 22419, 22816.

<u>Пытанне:</u> Хто можа быць удзельнікам праграмы добраахвотнага страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы і як у ёй узяць удзел?

З 1 кастрычніка 2022г. у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27.09.2021 нумар 367 "Аб добраахвотным страхаванні дадатковай назапашвальнай пенсіі" (далей – Указ) уведзены дадатковы від пенсіённага страхавання - добраахвотнае страхаванне дадатковай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы.
Указам ажыццяўленне добраахвотнага страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі ўскладзена на рэспубліканскае унітарнае страхавое прадпрыемства "Стравіта".

Удзельнікамі праграмы добраахвотнага страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі могуць быць грамадзяне, якія працуюць, за якіх выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы ў ФСАН, пры гэтым узрост іх павінен быць для жанчын - маладзей 55 гадоў, для мужчын - 60 гадоў.

Для таго, каб стаць удзельнікам праграмы добраахвотнага страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі неабходна:
1. Падаць заяву ў РУСП «Стравіта» (можна анлайн на сайце https://stravita.by) і заключыць дамову
2. Выбраць тарыф - ад 1 да 10%
3. Вызначыць тэрмін, на працягу якога будуць рабіцца выплаты (5 ці 10 гадоў)
4. Паведаміць працадаўцу аб заключэнні дагавора (прадставіць копію пасведчання і заяву аб утрыманні страхавых узносаў).
Дадаткова інфармацыю па гэтым відзе страхавання можна атрымаць на сайтах: РУСП «Стравіта», Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.